## ДЛЯ ЛЕПШАЙ ДЫЯГНОСТЫКІ

**Дзякуючы грантавай дапамозе ўрада Японіі Брэцкая абласная і Лунінецкая раённая бальніцы атрымалі новае дыягнастычнае абсталяванне.**

— У Лунінецкім раёне 45 населеных пунктаў маюць узровень забруджвання ад 0 да 5 кюры, — расказала **галоўны ўрач цэнтральнай раённай бальніцы Святлана ХЛЕБУС**, — там пражывае 45 тысяч чалавек. І вядома, своечасовы маніторынг стану здароўя насельніцтва — адзін з галоўных клопатаў раённай медыцыны.

Новы апарат ультрагукавой дыягностыкі з наборам інструментаў ужо паспяхова працуе ў стацыянары. На ім даследуюць сэрца, сасуды, малочную і шчытападобную залозы. Абсталяванне характарызуе высокая дакладнасць. Так, рак малочнай залозы можна разгледзець пры памеры пухліны ў 3 мм, рак шчытападобнай залозы — пры пухліне ў 2—3 мм. Пры такім раннім выяўленні хваробы шанцы на паспяховае лячэнне і выздараўленне ўзрастаюць. На ранніх стадыях выяўляюцца таксама паталогіі сэрца і сасудаў.

У Брэсцкую абласную бальніцу паступіў урэтэрарэнафіброскоп. Апарат выкарыстоўваюць для дыягностыкі захворванняў нырак, для лячэння мочакаменнай хваробы.

Агульны кошт абсталявання складае больш за 70 тысяч долараў. Яно закуплена па праграме «Карані травы», якая рэалізуецца ў нашай краіне ўрадам Японіі. За 13 гадоў медыцынскія ўстановы раёнаў, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі, атрымалі больш за дзве сотні адзінак абсталявання.

Цырымонію перадачы абсталявання медустановам Брэстчыны правёў **часовы паверанны ў справах Японіі ў Беларусі Хірокі ТАКУНАГА.** Падчас сустрэчы са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Анатолем Лісам дыпламат з удзячнасцю нагадаў, што пасля аварыі на Фукусіме Беларусь падзялілася вопытам па ліквідацыі наступстваў атамнай катастрофы, а таксама паведаміў, што Японія мае намер працягваць праграму «Карані травы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

У ПОЛІ ЗРОКУ

# У СПІСАХ НЕ ЗНАЧАЦЦА, АЛЕ ХОДЗЯЦЬ ПА МЯЖЫ

## Ці здольны праблемныя сем'і палепшыць умовы пражывання і паводзіны

**УСЕ праблемныя сем'і праблемныя па-рознаму, але маюць шмат агульнага — адзначаюць спецыялісты. І гэта агульнае найчасцей мае вадкі стан і пэўны градус. А далей высякаюць наступствы: есці не наварана, у хаце не прыбрана, дзеці недагледжаныя, а часта і хлеба няма за што купіць.**

**Пётр ГУБЕЙ, старшыня Маларыцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Лічбы, якія прыводзіліся па праблемных сем'ях, маюць адносны характар, бо ўвесь час мяняюцца: адну сям'ю здымаюць з уліку, іншую ставяць... Самае горшае, калі даводзіцца пазбаўляць бацькоў іх правоў і забіраць дзяцей. Ужо ў гэтым годзе суды прынялі рашэнне ў дачыненні да чатырох бацькоў, шасцёра дзяцей атрымалі апекуноў. Значыць, агульная работа ў названых выпадках не дала чаканых вынікаў...

Нядаўна сустракаўся з сям'ёй, якую даўно трымаю ў полі зроку. Бацькі ўсё жыццё злоўжывалі гарэлкай. Двое дзяцей выраслі, атрымалі спецыяльнасці, уладкаваліся на працу, у рот не бяруць спіртнога. Бацька іх самакрытычна заўважыў: «Сам не ведаю, у каго яны ўдаліся». Дакладна, гэтыя дзеці бралі за ўзор не бацькоў. Дык вось, гэты прыклад гаворыць аб тым, што працаваць трэба нават з самымі праблемнымі сем'ямі, калі там растуць дзеці. Некаторыя і не значацца ў спісах, але ходзяць, што называецца, па мяжы. Іх важна пастаянна трымаць пад увагай — такая пазіцыя ў нас са старшынямі сельскіх Саветаў.

Такія сем'і, на жаль, цяпер ёсць калі не ў кожнай вёсцы, дык у кожным сельсавеце дакладна. У Маларыцкім раёне 147 дзяцей з 66 сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане. Гэта значыць, іх пастаянна кантралююць адпаведныя службы.

Некалькі сем'яў названага спіса пражываюць у Чарнянскім сельсавеце. «Але не толькі іх даводзіцца трымаць пад кантролем, ёсць і іншыя, тыя, хто балансуе паміж нормай і праблемнымі паводзінамі. І калі іх на нейкі час выпускаеш з поля зроку, яны, што называецца, разнявольваюцца», — гаворыць **старшыня сельвыканкама Аляксандр ПЯТРУЧЫК.**

Летась, на жаль, адну шматдзетную маці давялося пазбаўляць бацькоўскіх правоў. За яе сям'ю пэўны час змагаліся, спрабавалі выхоўваць жанчыну, прымаць меры грамадскага ўздзеяння... Спачатку забралі дзяцей на паўгода ў прытулак. Ёй жа паставілі задачы па навядзенні парадку ў хаце, па выпраўленні ўласных паводзін, гэта значыць парэкамендавалі менш налягаць на выпіўку. Але маці пяцярых дзяцей да парад не прыслухоўвалася, гаварыла, што ўсё роўна праз паўгода дзяцей вернуць, а цяпер яна хоць адпачне. Потым, калі чарговы раз кабету строга папярэдзілі, смецце з хаты вынесла, сякі-такі рамонт зрабіла. Дзяцей вярнулі. А праз пару дзён даму заўважылі на вясковай вуліцы ў нецвярозым стане. У дзень, калі старшыня сельскага Савета з прадстаўніком аддзела адукацыі наведалі сям'ю, у доме была гулянка, маці сямейства сядзела за сталом з сабутэльнікам. Найбольш абурыла прадстаўнікоў улады харчаванне самага меншага дзіцяці, яшчэ немаўляткі. Малое сядзела ў ложку і ссала малако з паўтаралітровай пластыкавай бутэлькі. Пасудзіна была яўна даўно не мытая, малако на сценках закісла... Дзяцей забралі ў той жа дзень.

> Калі яму за дзесяць прагулаў прызначылі 200 гадзін бясплатнай работы, тады чалавек асэнсаваў нявыгаднасць парушэння працоўнай дысцыпліны.

Праз некаторы час адбыўся суд. Праўда, на судзе жанчына пускала слязу, гаварыла, як любіць дзяцей. Але ёй не паверылі, бо піла і гуляла гора-маці на дзіцячую дапамогу. А цяпер яна абавязаная асоба і павінна кампенсаваць сродкі на ўтрыманне малых. На работу грамадзянку ўладкавалі ў мясцовую гаспадарку.

— Але названая гісторыя ўсё ж выключэнне, — гаворыць Аляксандр Пятручык. — Мы ж імкнёмся зрабіць усё, каб дзеці заставаліся ў сем'ях. За апошні час дзве шматдзетныя сям'і палепшылі жыллёвыя ўмовы, і сітуацыя памянялася ў лепшы бок. Сям'я з дзевяці чалавек Аляксандра і Яўгеніі М. жыла ў адным пакоі. Беспарадак на мяжы антысанітарыі даваў падставу аднесці дзяцей да тых, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане. Але сям'і выдзелілі дом у суседняй вёсцы. І гэта, можна сказаць, акрыліла шматдзетных бацькоў. У новым доме яны хутка навялі парадак. Прысядзібны ўчастак і двор утрымліваюць амаль узорна. У гэтай сям'і ёсць толькі адно слабае месца: гаспадар часам выпівае. Калі ён цвярозы, працаўнік — пашукаць такога, таму і дом належным чынам трымае, а калі сарвецца... Таму іх таксама варта трымаць пад кантролем.



Намеснік дырэктара школы Наталля МЯРЧУК і старшыня сельскага Савета Аляксандр ПЯТРУЧЫК.

Калі яны адчуваюць увагу мясцовай улады, тады і паводзяць сябе больш абачліва.

Яшчэ адна сям'я пражывае ў Чарнянах. Там праблема крыху іншага кшталту. Бацька сямейства, у якім растуць пяцёра дзяцей, мае статус сужыцеля. Ён даволі доўга не мог зарэгістраваць шлюб, бо не меў дакументаў. На час развалу Савецкага Саюза мужчына пражываў у Расіі, потым за нейкае правапарушэнне трапіў у турму, пазней згубіў дакументы. У выніку толькі нядаўна атрымаў від на жыхарства асобы без грамадзянства ў вёсцы, дзе нарадзіўся. Але П. працуе ў мясцовым калгасе, ад абавязкаў па выхаванні дзяцей не ўхіляецца. Сям'я трапіла ў спісы найперш з-за ўмоў пражывання. А цяпер ім далі дом у Чарнянах, і абстаноўка палепшылася. Але і гэтых бацькоў старшыня сельскага Савета лічыць патрэбным трымаць у полі зроку, бо часам гаспадар усё ж прыкладваецца да чаркі.

**Намеснік дырэктара Чарнянскай сярэдняй школы Наталля МЯРЧУК** гаворыць, што цяпер у дачыненні да бацькоў вучняў з дзвюх названых сем'яў ніякіх нараканняў няма. Дзеці не прапускаюць заняткаў, рыхтуюць урокі, ходзяць у школу акуратна апранутымі. Наогул жа, школа працуе разам з сельскім выканкамам па ўсіх праблемных сем'ях, і на савеце прафілактыкі абавязкова прадстаўнік адміністрацыі школы бывае. І дадому да вучняў настаўнікі зазіраюць.

На саветы прафілактыкі, якія праходзяць у сельвыканкаме, запрашаюць бацькоў праблемных сем'яў, абавязаных асоб, у якіх ёсць пытанні з паводзінамі. Для некаторых гэтая мера калектыўнага выхавання бывае дзейсная, іншыя фактычна не рэагуюць. Вось, скажам, выклікалі на савет абавязаную асобу Мікалая М. з прычыны нядбайных адносін да працы на рабочым месцы. Ён паслухаў ды пайшоў. А калі яму за дзесяць прагулаў прызначылі 200 гадзін бясплатнай работы, тады чалавек асэнсаваў нявыгаднасць парушэння працоўнай дысцыпліны. Старшыня сельскага Савета лічыць, што ўсе формы прафілактыкі трэба выкарыстоўваць, але найлепшыя вынікі дае індывідуальная работа. Калі заязджаеш у дом, там можна гаварыць прадметна. Бо на савеце прафілактыкі асобныя гаспадыні робяць вялікія вочы і запэўніваюць, што ў іх усё амаль ідэальна. А калі ў хаце ім паказваеш на шэра-чорную пліту, якая некалі была белай, то іншая шматдзетная гаспадыня ўсё ж часам пачырванее. І так паэтапна, бывае, дабіваешся хоць нейкага элементарнага парадку: спачатку памыюць пліту, потым вокны, прывядуць да належнага выгляду дзіцячыя рэчы. Вось што ўяўляе сабой індывідуальная работа.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Маларыцкі раён.*